*Зміцер Давідоўскі*

# Становішча ў беларускай літаратуры на мяжы 30-х гадоў

## 1

### Гартны — Гарэцкі — Дубоўка — Бабарэка

Сядзіць дзядзя лысы
Ля дзяржаўнай місы.
Капялюш бярлінскі,
А характар свінскі.

Менавіта такая эпіграма хадзіла ў асяроддзі беларускіх пісьменнікаў і беларускай інтэлігенцыі ў 20-х — 30-х гадах ХХ стагоддзя, і прысвечана яна была Цішку Гартнаму (Зміцеру Жылуновічу — *З. Д.*), беларускаму пісьменніку і дзяржаўнаму дзеячу аднначасова.

Тэкст эпіграмы з'явіўся пасля таго, як у Берліне былі надрукаваныя зборнік Цішкі Гартнага «Песні працы і змагання» і першая частка рамана «Сокі цаліны». Тут неабходна крыху збочыць з выбранага напрамку і сказаць, што Жылуновіч па заключаным пагадненні выдаў больш за 30 000 экзэмпляраў каштоўных кніг айчынных аўтараў, але ў тагачаснай беларускай інтэлігенцыі выклікаў абурэнне менавіта факт выдання Цішкам Гартным яго кніг, прычым за свой кошт. Пісьменнікі былі абураныя яго палітыкай як кіраўніка Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі і літаратурнага згуртавання «Полымя». Жылуновіч пачаў друкаваць творы толькі тых пісьменнікаў якія былі сябрамі «Полымя», а таксама тых, хто быў яму даспадобы. Ні маладнякоўцы, ні ўзвышэнцы ў часопісе «Полымя» і ДВБ наогул не друкаваліся. І таму многія пісьменнікі вымушаны былі друкавацца дзе заўгодна (у маскоўскіх выдавецтвах або ў Гомелі і іншых гарадах Беларусі), толькі не ў Мінску. Там яны зрабіць гэтага не маглі па «высочайшему повелению» Цішкі Гартнага. Напрыклад, зборнік вершаў Уладзіміра Дубоўкі «Наля» (М. : «Центроиздат», 1927) убачыў свет толькі ў Маскве менавіта з-за палітыкі Ц. Гартнага.

Зараз давайце крыху адыдзем ад галоўнай тэмы і коратка пазнаёмімся з біяграфіяй Цішкі Гартнага.

Нарадзіўся Зміцер Хведаравіч Жылуновіч 4 лістапада (22 кастрычніка па старым стылі) 1887 года ў мястэчку Капыль. «То была пара, калі ў хаце пераходзілі ад цяжкое падзёншчыны на нудную, чуць не дарэмную "здзельшчыну"», — скажа пазней пісьменнік у сваёй аўтабіяграфіі «Абеглы саманарыс майго жыцця». У сям'і «не было ні каня, ні каровы, ні поля, каб рабіць». Бацька працаваў гарбаром, маці — падзёншчыцай. Рана вымушаны быў узяцца за працу і будучы пісьменнік: у гарбарнай майстэрні, пастухом па найме.

Чытаць «поверху» навучыў бацька. Потым была вучоба ў «дарэктараў» — хатніх настаўнікаў. За гэты час «прайшоў усе царкоўна-славянскія кніжкі, якія толькі былі ў бацькі. Нават і на нейкую… хрэстаматыю ўзбіўся. Грамата давалася лёгка…». У 1902 годзе паступае ў Капыльскае двухкласнае вучылішча, у 1905-м заканчвае яго. Летам працуе — пасвіць кароў. «Пасучы, я бесперастанку чытаў. Меў надзвычайную цягу да чытання». Чытаў пераважна рускіх пісьменнікаў: Някрасава, Нікіціна, Надсана, Чэхава, Талстога, Горкага, Пісарава, Успенскага… Становіцца актыўным чытачом у бібліятэцы капыльскіх сацыял-дэмакратаў, захапляецца іх дзейнасцю, збліжаецца з імі.

У газеце «Наша ніва», Гартны знаёміцца з вершамі беларускіх паэтаў, найперш Янкі Купалы і Якуба Коласа. Захапляецца імі. Гэтая газета і гэтыя вершы натхнілі пісаць па-беларуску. Жылуновіч пасылае свае творы ў «Нашу ніву». У студзені 1909 года ў газеце быў надрукаваны першы верш — «Бяздольны», прысвечаны Янку Купалу. Тэкст быў падпісаны псеўданімам: Цішка Гартны. У 1910 годзе ў той жа газеце быў надрукаваны верш «Не хіліся, дуб зялёны», які малады паэт

прысвяціў Якубу Коласу. «З гэтага моманту імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа зацямнілі сабою ўсе іншыя, з якімі я пазнаўся раней», — будзе згадана пазней. У 1909–1912 гадах Гартны не раз пакідаў роднае мястэчка. У пошуках работы ён вандраваў па гарадах Беларусі, Літвы, Украіны, Латвіі. Працаваў у гарбарных майстэрнях Вількаміра, Панявежыса, Шаўляя, Белай Царквы, Палтавы, Мітавы, Дзвінска, Магілёва, Жлобіна, Бабруйска, Смаргоні… Сустрэчы з новымі людзьмі, наведванне майстэрняў, прадпрыемстваў, нялёгкая шматгадзінная праца — то была сапраўдная школа жыцця.

У 1915 годзе Жылуновіч быў мабілізаваны ў войска. Праз месяц адпушчаны. У 1916-м працаваў у Беларускім бежанскім камітэце, выдаваў газету «Дзянніца». З 49 нумароў, што выйшлі ў свет, 23 нумары былі падпісаны Зміцерам Жылуновічам як рэдактарам. У гэты час газета адыграла важную ролю ў гуртаванні беларускіх рэвалюцыйных сіл. На пачатку 1917 года Цішка Гартны звязвае свой лёс з Беларускай сацыялістычнай грамадой. Становіцца адным з лідараў яе левага крыла. Падчас Лютаўскай рэвалюцыі сам прыняў у ёй актыўны ўдзел. У лютым 1918 года ён — сакратар Беларускага нацыянальнага камісарыята пры ўрадзе РСФСР. Некаторы час рэдагуе першую савецкую газету на беларускай мове «Дзянніца». У тым жа годзе, у кастрычніку, у Маскве быў прыняты ў члены РКП(б). Уваходзіў у склад бюро Беларускай секцыі РКП(б). 30 снежня ў Смаленску пачалася VI Паўночна-Заходняя канферэнцыя, якая была абʼяўлена І зʼездам Камуністычнай партыі Беларусі. Было прызнана неабходным абвяшчэнне БССР. Абраны Часовы рабоча-сялянскі савецкі ўрад Беларусі. Узначаліў яго Зміцер Жылуновіч. Ім быў напісаны Маніфест («Маніхвэст») пра абвяшчэнне БССР. Праўда, працаваць ураду гэтаму, па сутнасці, не давялося. Праз нейкі месяц уладу ўзялі прыхільнікі Цэнтральнага бюро КП(б) Беларусі, які ўзначальваў прамаскоўскі дзеяч Аляксандр Мяснікянц. Утваралася Літоўска-Беларуская ССР. Дакумент аб яе стварэнні падпісалі: армянін Мяснікянц, літовец Капсукас, рускія Іваноў і Пятроў, яўрэі Іофе, Рэйнгольд, Пікель, Найдзянкоў. Беларусаў не было. Нейкі час (з сакавіка 1919 года) Гартны зʼяўляецца выпускаючым рэдактарам і сакратаром газеты «Красная заря» (Харкаў). Летам (у чэрвені) 1919 года па партыйнай мабілізацыі становіцца палітработнікам у 14-й арміі на Паўднёвым фронце, у лютым 1920-га пераведзены ў штаб Заходняга фронту.

Працаваў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь», часопіса «Полымя», дырэктарам Дзяржаўнага выдавецтва і Дзяржаўнага архіва БССР. Быў намеснікам народнага камісара асветы БССР, членам Інбелкульта (Інстытут беларускай культуры). У 1928 годзе абраны акадэмікам АН БССР. 16.01.1931 з фармулёўкай «за свядомае правядзенне нацыянал-апартуністычнай і нацыянал-дэмакратычнай лініі, за ўдзел у антыпартыйных групоўках у КП(б)Б, за сувязь з чужымі і варожымі справе пралетарыяту нацдэмаўскімі і фашысцкімі элементамі» пастановай ЦКК КП(б)Б Цішка Гартны быў выключаны з партыі. ЦКК ВКП(б) пацвердзіла гэтую пастанову. Пазней, улічваючы прадстаўленую характарыстыку партарганізацыі завода «Камунар» і, галоўнае, прызнанне памылак, Прэзідыум ЦКК ВКП(б) палічыў магчымым праз год перагледзець гэтую пастанову. Але нічога не было перагледжана. 15 лістапада 1936 года Цішка Гартны быў арыштаваны органамі НКУС. У Мінскай турме яго жорстка катавалі, выбіваючы «патрэбныя» спецорганам паказанні і прызнанні. Быў абʼяўлены псіхічна хворым. Пераведзены ў Магілёўскую псіхіятрычную лячэбніцу. Паводле афіцыйнай версіі памёр ад гангрэны лёгкіх 11.04.1937. Па іншых звестках — скончыў жыццё самагубствам. Цішка Гартны быў рэабілітаваны ў грамадска-прававых адносінах, «за недаказанасцю злачынстваў», 15.10.1955. У 1988 годзе адбылася поўная палітычная рэабілітацыя — «за адсутнасцю саставу злачынства».

Такім чынам Цішка Гартны пражыў кароткае, але вельмі змястоўнае і адначасова трагічнае жыццё. Якія б ні былі адносіны і стаўленні беларускай інтэлігенцыі да пісьменніка, але ніхто не жадаў яму такога канца. Так, яго не любілі за карʼерызм, хамскае стаўленне да сваіх калег па літаратурным цэху, якія не падзялялі яго поглядаў на літаратуру, культуру ды і на ўсю тагачасную рэчаіснасць.

Вось аўтограф ліста Максіма Гарэцкага ў ЦК КП(б)Б адносна Цішкі Гартнага, які захоўваецца



У Ц.К. К.П.(б)Б. 223

Паважаныя таварышы!

Даведзены да крайнасці, пішу гэты ліст вось у якой справе:

1. Тав. Жылуновіч даштуль ня можа забыцца, што нікалі М. Багдановіч, які памёр 10 год таму назад, лічыў яго, Цішку Гартнага, бяздарнасцю. Аб гэтым сьведчаць выпады т. Жылуновіча супраць паэта (гл., напр.: зборнік „Беларусь", Менск, 1924; рэцэнз. Дорндорфа (Жылуновіча) на маю „Гіст. белар. літ." („Полымя" № 8, 1926 г.) і мой ліст у рэдакцыю „Зьвязды" з заявай аб Дорндорфу; „Працы Акадэмічнае Канфэрэнцыі", Менск, 926, і шмат іншых пісаных дакумэнтаў), кажучы, што Жылуновіч адмовіўся нават надрукаваць рамансы кампазытара Аладава на словы паэта, да 10 гадавіны яго сьмерці).

Я ня лічу т. Жылуновіча бяздарнасцю, але ў значнай меры падзяляю погляд на яго з боку М. Багдановіча (гл. маю „Гіст. белар. літар.", выд. IV, 1926). Вядома, і мая ацэнка не магла задаволіць т. Жылуновіча, і ён сыстэматычна мяне перасьледуе за гэта.

Дык паколькі ён такі імсьлівы і нестрыманы ў сродках, прашу ніколі ня верыць яму на слова, калі б ён стаў мяне абвінавачваць у чым-небудзь, а правяраць факта або спытацца ў каго-небудзь з другіх таварышоў.

2. У Выдавецтве я заўсёды цярпеў ад груба-хамскага абыходжаньня з боку т. Жылуновіча, цярпеў ад распушчанасьці т. Ільлючонка, а раней нават ад выхадак т. [illegible], які бачыў гэтыя адносіны і так сама пачаў голасна казаць мне на ўсю канцылярыю: „Чаго вы, аўтары, тут усё шляецеся?!" Цяпер т. Ільлючонак згодзіўся прыслаць мне на паперы просьбу аб выбачэньні, а т. [illegible], пасьля майго пратэсту, даўно ўжо абходзіцца пачцівасьцю.

Мае рэзкія словы ў першай і апошняй сварцы з т. Жылуновічам, што адбылася нядаўна ў Выдавецтве, у прысутнасьці т. Касянкова, які быў падгалоскам у т. Жылуновіча і так сама бараніў т. Ільлючонка і нападаў на т. Бядулю, мае рэзкія словы былі скіраваны супраць асоб (у тым ліку і некаторых беспартыйных), а ня партыі, што т. Зарэцкі, спадзяюся, не адмовіцца засьведчыць. Мае адносіны да партыі вядомыя.

3. Я ніколі не хаджу „шаптаць", а ў крайнасьці пішу аб сваіх крыўдах адкрыта, як гэта зрабіў і т. Бядуля. І сказанае мною ў вочы т. Жылуновічу паўтараю тут на паперы: лепей хачу быць такім „мешчанінам", „шаптуном", „даносчыкам", як мой даўні сябар т. Бядуля, чым такім „таварышам", як т. Жылуновіч.

4. Тав. Жылуновіч, пры т. Зарэцкім, сказаў: „Пакуль я на чале Выдавецтва, дык той, хто так кажа, не атрымае ні капейкі!.." На гэта я яму адказваю: калісь я напісаў афіцыяльную заяву ў Выдавецтва, што калі адносіны да мяне ня зьменяцца, я ня дам болей у Выдавецтва ніводнага радка. Адносіны зрабіліся яшчэ горшымі, і я ня дам у Выдавецтва ні радка, пакуль там будзе сядзець т. Жылуновіч. Пэўна-ж я ня Купала, але-ж я грамадзянін.

20 ліпеня 1927 г.
Менск.

М. Гарэцкі.



ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (Ф. 4п. Воп. 1. Адз. зах. 3041).

Гэты ліст нашага таленавітага пісьменніка знаходзіцца сярод дакументаў ЦК КП(б)Б у Сакрэтным аддзеле. Што самае цікавае, сярод дакументаў гэтага так званага Сакрэтнага аддзела знаходзяцца паперы якія раскрываюць тагачаснае становішча ва Усебеларускім аб'яднанні паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк», а таксама варыянты праграмна-статутных дакументаў літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша». Менавіта матэрыялы з Сакрэтнага аддзела далі штуршок для напісання дадзенага артыкула.

Як вынікае з аўтографа, гэты ліст быў напісаны М. Гарэцкім 20 ліпеня 1927 года ў Мінску. Дзякуй яму за такую дакладную дату напісання, бо пячатка ЦК КП(б)Б нечытэльная. Наш славуты пісьменнік па пунктах і вельмі падрабязна распісаў, чым давёў яго да адчаю З. Жылуновіч (і не толькі яго). У сваім лісце Максім Гарэцкі абараняе не толькі ўласную годнасць, але і свайго сябра Змітрака Бядулі (Самуіла Плаўніка — З. Д.). М. Гарэцкі быў далёка не першы, каго Цішка сваімі хамскімі паводзінамі даводзіў да крытычнага стану. У лісце адзначана тое, што Ц. Гартны адмовіўся друкаваць на старонках свайго часопіса матэрыялы Акадэмічнай канферэнцыі па змене беларускага правапісу і азбукі (1926) (а гэта далёка не другарадны матэрыял), а таксама рамансы кампазітара Мікалая Аладава на вершы Максіма Багдановіча толькі з-за таго, што калісьці пясняр пакрытыкаваў паводзіны З. Жылуновіча і яго агульначалавечыя стасункі з пісьменнікамі і не толькі. На той момант М. Багдановіча не было ў жывых ужо дзесяць год. Гэта ж якія ў чалавека павінны быць самалюбства і злапамятнасць, каб баяцца і ненавідзець нават нябожчыка…

У гэтай спрэчцы з Цішкай Гартным У. Дубоўка і А. Бабарэка не былі выключэннем. Сябры здзекліва перараблялі яго псеўданімы: Друк-Дрэк, Язэп Чырвонь-Цовік і г. д. Вось што пісаў У. Дубоўка свайму сябру А. Бабарэку: «…справа, зрэшты, не ў грошах, а ў нахабстве Дрэкаў і Цовікаў…».[1]

Цішка Гартны мог пад дзвярыма свайго дырэктарскага кабінета пратрымаць чалавека з ранку да вечара, і ў выніку разлаваны наведвальнік пакідаў выдавецтва. Такое здаралася вельмі часта. Мала хто мог дагадзіць Гартнаму. Але не трэба забывацца пра тое, што Я. Купала,

[1] Дубоўка, У. Збор твораў : у 2 тамах / У. Дубоўка. — Мінск, 2017. — Том 2. — С. 214.

напрыклад, вельмі высока цаніў талент З. Жылуновіча. Вось яго словы: *«Цішка не "майструе вершаў", а пяе, пяе ўсёй сваёй набалелай душой, усім сваім сэрцам гарачым, кіпучым. Нойдзеце тут і галубіныя песні кахання, і сумныя жальбы, і смелыя жаданні, і ва ўсім чуваць песняра праўдзівага, вынасіўшага кожнае слова ў сваіх набалелых грудзях»* (Агляд кніг, 1913). А, як вядома, Я. Купала слоў на вецер не кідаў і не хваліў пісьменнікаў, як кажуць, ні за што, каб толькі пацешыць аўтара. Наш славуты пясняр без усялякіх закулісных гульняў заўжды казаў тое, што думаў пра чалавека і яго творчасць, у твар.

Тагачасныя беларускія пісьменнікі гэтак жа, як і Купала, вельмі высока цанілі талент Гартнага. Аб гэтым, дарэчы, піша ў сваім лісце і сам Максім Гарэцкі. Але ж робіць націск на тое, што ён грамадзянін і патрабуе да сябе паважлівых адносін. Такога ж стаўлення пісьменнік патрабаваў і да сваіх калег.

Свой ліст ў ЦК КП(б)Б Максім Гарэцкі заканчвае наступным чынам: «Пэўна ж я не Купала, але я грамадзянін»[1].

Зараз вернемся да У. Дубоўкі з А. Бабарэкам. Перапіска нашых славутых пісьменнікаў раскрывае сапраўднае стаўленне да Цішкі Гартнага і да групы «Полымя» цалкам. Я ужо цытаваў ліст Дубоўкі да Бабарэкі ад 28 сакавіка 1928 года. Але гэта далёка не выпадковае выказванне паэта. Самая мілагучнае вызначэнне ў бок Цішкі Гартнага з вуснаў У. Дубоўкі гучала наступным чынам: «Гарыла ў берыеўскіх акулярах». Але паэт не саромеўся і на больш моцныя выразы. У сваім лісце да Адама Бабарэкі ад 23.01.1929 Уладзімір Дубоўка піша наступнае: «Дайце ў № 2 рэцэнзію пра Цішку з "Літпосту" па-расейску з такой заўвагай: "Той самы Селівановскі, пра якога Ц. Гартны ў "Полымі" №… за 1928 г. пісаў, што гэта вельмі выдатны крытык, напісаў пра Цішкавы "Трэскі на хвалях" вось што: "Своя своих не познаша?!"»[2]. І зноў жа у тым лісце сустракаем здзеклівую мянушку Цішкі Гартнага — Дрэк. Як бачым, супрацьстаянне двух лагераў (з аднаго боку Цішка Гартны і яго «Полымя», Уладзімір Дубоўка, Адам Бабарэка і літаратурнае згуртаванне «Узвышша» — з другога) цягнулася аж но да самага арышту гэтых выбітных пісьменнікаў. Ніжэй друкуем аўтограф ліста Уладзіміра Дубоўкі ад 19.04.1928 які захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музее літаратуры і мастацтва (Ф. 407. Воп. 1. Адз. зах. 149. Арк. 15). У гэтым лісце паэт просіць перадрукаваць


15
19/IV-28, Масква
Браце Адам!


12 чэрвеня 1924.
Масква
Браце Міхась!

[1] Захаваны правапіс Максіма Гарэцкага.

[2] Дубоўка У. Збор твораў : у 2 тамах / У. Дубоўка. — Мінск, 2017. — Том 2. — С. 277.



Копія.

У Цэнтральнае Бюро "Маладняка"

Ад сяброў аб"яднаньня: Я. Бобрыка, А. Звонака, В. Каваля, Кляшторнага, Е. Маракова, І. Плаўніка, Я Туміловіча [redacted]

З А Я В А.

105

За апошнія час у нашай арганізацыі заўважаюцца некаторыя моманты, супроць якіх мы выказваем незадавальненьне і катэгарычна патрабуем ЦБ у мэтах большага адзінства і моцы арганізацыі, зьлiквiдаваць гэтакія.

I. Наша арганізацыя у першую ч аргу--пісьменьніцкая і мы лічым, што ўсе справы, якія датычацца ўсяе арганізацыі павінны ня ськравацца кіруючымі органамі вархушкамі, ад усіх сяброў. Пакуль што мы бачым, што у нас маецца дзьве катэгорыі сяброў: "старэйшыя" і "маладыя". Катэгорыя "старэйшых" скрытна праводзіць сваю волю у арганізацыі, ня лічачыся з астатнімі.

2. Есьць выпадкі што без пэўных прычын зборнікі "маладшых" ляжаліся па году у ЦБ, у той час, калі старэйшыя здавалі зборнікі і іх за некалькі тыдняў друкавалі. Справа абстаіць так, што без пэўных прычын маладзейшым альбо зусім не даюць друкавацца, альбо даюць неахвотна. Некаторыя з сяброў рэдкалегіі вельмі перагружаны працай, альбо па якіх іншых прычынах не спраўляюцца свеч асова выконваць сваіх абавязкаў. Мы лічым што патрэбна у рэдкалегію увесьці яшчэ двух сяброў, з маладзейшых. Тады зьнішчацца тыя ненармальнасьці, якія зьнікаюць дзякуючы палітыцы "старэйшых". Мы просім ЦБ увесьці кіраўніка Менскай філіі і яшчэ аднаго па погляду ЦБ.

3. Мы знаходзім, што зборнікі павінны рэдагавацца адчынена, каб была таварыская сувязь між рэдагуючым і аўтарам т. зн. рэдагуючы павінен рабіць заўвагі, даваць парады, абгаварваць іх супольна з аўтарам.

4. Старэйшыя не дапамагаюць маладзейшым выбіцца на літаратурны шлях. Зараз мы лічым што неабходна нашай арга-



-2-

107

нізацыі ахапіць і больш здольных маладзейшых, дапамагчы ім стаць на правільным шляху літаратурнага разьвіцьця, паколькі старэйшыя таварышы маюць больш вопыт у гэтай працы. У гэтым напрамку дагэтуль пакуль што нічога не зроблена.

5. Зараз у шэрагах "Маладняка" ставіцца пытаньне аб матэр"яльнай незабясьпечанасьці некаторых маладнякоўцаў. Есьць выпадкі што хлопцы жывуць толькі з ганарару. Яны стаяць перад пагрозай сьпісацца і г. д. Процант незабясьпечанасьці падае выключна на маладзейшых. Рэдкалегія ні на чым не грунтуючыся выплачвае старэйшым па 40 кап. за радок, у той час калі маладзейшым плоціць толькі па ад 15 да 25 кап. Мы катэгарычна ставім пытаньне каб такіх разьмяркаваньняў у выплаце не было і такіх ставак як 15 кап. таксама не было. У той час, калі узьнімаецца пытаньні аб павышэньні ганарарных ставак, у нас дзеецца зусім наадварот. Лепш тады зусім не друкаваць, чым расцэньваць ні ўва што творчасьць.

Прымаючы пад увагу усе вышэйпаданае, мы настойліва просім ЦБ разгледзець гэтую заяву на першым-жа пасяджэньні Бюро і зьнішчыць усе памянёныя недарэчнасьці; бо пры тых умовах, якія склаліся за апошнія часы працаваць разам далей немагчыма.

Падпісалі:

Менск, 4-га красавіка 1927г.

згаданы раней ліст М. Гарэцкага ад 20 ліпеня 1927 года. Дарэчы, гэты ліст паказвае сапраўднае становішча ўсяго тагачаснага літаратурнага працэсу, а не толькі формулу: «Цішка Гартны — Максім Гарэцкі, Уладзімір Дубоўка і Адам Бабарэка».

У. Дубоўка, напрыклад прапануе адзначыць юбілей М. Гарэцкага ў «піку» юбілею М. Чарота і надрукаваць гэта ў № 2 «Узвышша» за 1928 год. Як бачым пісьменніцкая вайна ішла не толькі паміж Ц. Гартным, М. Гарэцкім, У. Дубоўкам і А. Бабарэкам, а на ўсім літаратурным фронце цалкам.

Вышэй падаём ліст Уладзіміра Дубоўкі да Міхася Чарота, у якім ён просіць надрукаваць на старонках часопіса «Маладняк» яго артыкул пра зборнік вершаў Я. Журбы «Заранкі» (выдавецтва «Савецкая Беларусь»). Паэт гэтым зборнікам рабіў своесаблівую справаздачу за 15 год уласнай творчасці. «Маладняк» надрукаваў гэты артыкул пад псеўданімам Ул. Гайдукевіч («Маладняк» — 1924. — № 5. — с.107–114). У ім паэт вельмі шкадуе, што кніжка выйшла зусім маленькім тыражом — 3000 асобнікаў. Эх, нам бы сёння такія «маленькія» тыражы… Гэта сапраўды была не рэцэнзія, а агляд творчасці Я. Журбы за 15 год (1909–1923). Праўда, калі ішла рэгістрацыя літаратурна-мастацкага згуртавання «Узвышша», М. Чарот вельмі пашкадаваў, што прапусціў гэты артыкул у друк. Менавіта з гэтай прычыны я прывёў аўтограф ліста У. Дубоўкі да М. Чарота.

## 2
## «Маладняк» — БелАПП — Беларускі саюз пісьменнікаў

Такім чынам, Усебеларускае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк» дажывала лічаныя месяцы, бо ў лістападзе 1928 года гэтае згуртаванне ператварылася ў БелАПП — Беларускую асацыяцыю пралетарскіх пісьменнікаў, якая ў 1932 годзе ператварылася ў Саюз беларускіх пісьменнікаў. Яна спыніла дзейнасць у адпаведнасці з пастановай ЦК КП(б)Б «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый БССР» (27 мая 1932). Менавіта да гэтага часу існаваў і часопіс «Маладняк» які быў літаратурна-грамадскім органам БелАПП. Гэтае ператварэнне «Маладняка» адбылося толькі дзякуючы расколам у аб'яднанні, што пачаліся яшчэ ў лістападзе 1925 года і скончыліся стварэннем на яго базе БелАПП.

Ніжэй друкуем у поўным аб'ёме заяву сяброў «Маладняка» Я. Бобрыка, А. Звонака, В. Каваля, Т. Кляшторнага,

В. Маракова, І. Плаўніка і Я. Туміловіча ў Цэнтральнае Бюро «Маладняка» з пратэстам супраць становішча, якое склалася ў згуртаванні, а таксама адносін да маладых сяброў згуртавання. Першапачаткова аўтараў ліста было восем, але адно прозвішча старанна закрэслена, таму вызначыць, хто гэта, не ўдалося. Заява датаваная 4 красавіка 1927 года і заканчваецца рашучым намерам выйсці з «Маладняка» ў тым выпадку, калі пералічаныя недахопы ў рабоце згуртавання, на якія ўказалі пісьменнікі, не будуць ліквідаваныя Цэнтральным Бюро.

Калі гнеўны ліст напісалі такія сапраўдныя патрыёты «Маладняка», як Я. Бобрык, В. Маракоў, Т. Кляшторны (што з'яўлялася, па сутнасці, вынясеннем дыягназу згуртаванню), то яно было ў стане перадсмяротнай агоніі. І сапраўды, крыху больш чым праз год «Маладняк» як літаратурнае згуртаванне перастаў існаваць наогул.

Усебеларускае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк» было арганізавана ў лістападзе 1923 года як літаратурнае згуртаванне, скіраванае на пошук і раскрыццё маладых таленавітых літаратараў у сялянскім і пралетарскім асяроддзі, каб яны сваімі праўдзівымі, а галоўнае, таленавітымі творамі ўзбагацілі і развілі беларускую мову і літаратуру. Але далёка не ўсе сябры «Маладняка» мелі такія здольнасці. Па-першае, сябрам «Маладняка» не хапала добрага ведання роднай беларускай мовы, па-другое — таленту. І таму на старонках часопіса «Маладняк» хутка пачалі з'яўляцца даволі шэрыя творы у якіх не было аніякіх мастацкіх каштоўнасцей — форма, змест, вобраз, мова. Але, нягледзячы на гэта, сябры згуртавання паставілі сябе па-за крытыкай. Ніхто не меў права іх крытыкаваць і рабіць заўвагі, бо яны развіваюць сапраўдную беларускую пралетарскую літаратуру. Такая палітыка і прывяла да расколу згуртавання. Гэты раскол быў падобны на моцны землятрус і закрануў згуртаванне ад Цэнтральнага Бюро да шматлікіх філій. Прыводзім адзін з дакументаў на тэму расколу Мсціслаўскай філіі «Маладняка».

4 студзеня 1927 года адбылося пасяджэнне бюро акружкама, на якім абмеркавалі становішча ў мсціслаўскай групе «Маладняка». Аказалася, што пра стварэнне групы «Агняцвет» мясцовыя ўлады нічога не ведалі. Прадстаўнік Калінінскага акружкама З. Палякоўскі зрабіў вывад аб строгай канспірацыі ў групе. З ініцыятарамі стварэння «Агняцвета» была праведзена гутарка. Яны настойвалі на тым, што аб расколе маладнякоўскай групы не думалі, а проста хацелі, каб існаваў гурток, дзе лепш працавалася б у маштабе акругі. Але яшчэ 16 студзеня 1927 года З. Астапенка з Ю. Таўбіным абвясцілі літаратурнае


У БЮРО АКРУГКОМУ К.П.Б.

39

Згодна Вашага указаньня на конт высьвятленьня пытаньня аб расколе у Мсьціслаускай групе "Маладняк", паведамляю наступнае:

1) Па прыездае у Мсьціслауль мною у гутарках з сакратаром РК КПБ-т.Кавалевым высьвятлена, што ен, ні афіцыйны прадстаунік ДПК па Мсьціслаускаму раёну т.Чарнецкі аб расколе у групе "Маладняке" і аб сазданьні асобнай групы "Агнецьвет",нічога не вядома.

2) Пасьля майго азнаямленьня імі аб тым, што Мсьціслауская група "Маладняк" раскалолась, быу выклікан сакратар камсамольскай ячэйкі педтэхнікуму, які таксама заявіу, што ен аб расколе нічога ня ведае і што у іх па яго думцы, кажысь і нічога ня было.

3) Тады мы рашылі выклікаць хлапцоу з групы "Маладняк", на якіх магло быць у думцы, што яны адкалоліська (камсамольцы) пасьля гутарак з імі сакратаром РК КПБ -т.Кавалевым, яны спачатку адмаулялісь, але потым, калі убачылі, што аб гэтым ведаюць,яны прызналісь і казалі, што ня думалі ні аб якім расколе, а думалі толькі скласьці такі гурток, у яком лепей было-бы працаваць,прычым аб'яднаньне "Агнецьвет" яны лічылі аформіць у Акруговым маштабе, а потым, яны-бы аб гэтым і давелі-бы да ведама,як РК ЛКСМБ, так і РК КПБ.

4) Пасьля некалькіх гутарак з імі, яны прадставілі увесь матэр'ял па гэтаму пытаньню (запытальныя лісты, дэкларацыі,статут, перапіска з Хоцімскімі хлапцамі), прычым дадалі, што у аднаго з іх, кажыць у Астапенка, у мінулым годзе была перапіска з Якубам Коласам (матэр'ял прадстаулен у АК КПБ).

5) Пры гутарках з гэтымі хлапцамі на котн абмылковасьці іх паступка, г.з. што яны усю гэту працу вялі нялегальна (скрыта ад усіх),яны прызналі сваю памылку, лічылі усе гэта мальчышаствам і прасілі даць ім магчымасьць працаваць далей у Маладнякоускай групе.

6) Пры маем ад'ездзе з Мсьціслаушчыны, яны уже прыступілі да працы у Маладнякоускай групе, падрыхтоувалі выпуск часопісі "Маладняк" і зьвярнулісь к сакратару РК КПБ-т.Кавалеву, каб ен


\- 2 -

40

ім дау кіруючы артыкул у гэтай часопісі.

Я лічу па гэтаму пытаньню мока быць два вар'янта:

1. Магчыма, што гэтыя хлопцы прыступілі да арганізацыі новай групы "Агнецьвет" на сваей ініцыятыве для таго, штоб лепей была працаваць, тады гэта пытаньне вельмі легка развязанае алеж мне ня верыцца, каб такія маладыя хлопцы маглі настолька канспэратыуна весьці працу самастойна, каб аб гэтым ніхто ня ведау, прычым надта характэрна, што у сваіх пісьмах Хоцімскім хлапцам яны у канцы дапісывалі, што аб гэтых пісьмах ніхто не павінен ведаць, а у сваем статуце у іх маецца пункт, што кожны сябр "Агнецьвета" піша свае літаратурныя творы пад псеуданімам, а сапраудные прозьвішча ведае толькі радактар часопісі, вот здесь мы і падыходзім к другому вар'янту.
2. А другі вар'янт састаіць у тым, што магчыма яны вялі гэту працу пад якім-небудзь указаньнем больш сьвядомых людзей ведаючыя, як конспірацыю, так і наогул, як трэба весьці працу па расколу. Калі застанавіцца на другім вар'янце,то здесь трэба глядзець у оба, бо магчыма першую няудачу можа не застанавіць главарэй працягваць сваю працу.

У данный момант я лічу, што гэтым хлапцам трэба даць магчымасьць працаваць у Маладняку больш іх ня дзергаць а толькі кіраваць імі і дамагаць іззіць сваю абмылку, бо усякае дзерганьне іх можа дрэнна на іх адбіцца і загнаць яшчэ больш у падпол'е, бо як відна яны ведаюць конспірацыю.

З.ПАЛЯКОУСКІ

19 студзеня 1927 году.

17р70к





Для аб"вяшчэньня у "Нашым Працаўніку"

41

У сьнежне 1926 г. мы ініцыятыўная група гор. Мсьціслаўле заклалі Калінінскае літэратурнае згуртаваньне "Агняцьвет".
Гэтае згуртаваньне мэтай якога было сяброўскае аб"яднаньне лепшых літэратурных сіл Калінішчыны пагражала развалам "Маладнякоўскіх груп". Усьведаміўшы зараз сваю памылку і лічучы гэтае аб"яднаньне шкодным і непатрэбным, мы абвешчаем "Агняцьвет" ліквідаваным, мы заклікаем усіх таварышоў уцягнутых у гэту арганізацыю адмовіцца ад "Агняцьветаўскіх" ідэй і зноў прыняцца за працу па Маладняковскім групам.

Просім Хоцімскіх т.т. на дасланыя ім лісты, лічыць нядзейнічаючымі і памылковымі. Толька у "Маладняку"-кузьні літэратурных сіл пад кіраўніцтвам партыі і камсамолу мы зможым выхаваць сябе сапраўдных пралетарскіх пісьменьнікаў.

Ілія Таубен
Зьмітрок Астапенка.

Мсьціслаў
16/1-27 года.

згуртаванне «Агняцвет» ліквідаваным, і ўся група перайшла працаваць у «Маладняк». І незразумела, чаму у Калінінскім акружкаме КП(б)Б пра існаванне «Агняцвета» не ведалі яшчэ ў красавіку таго ж 1927 года, калі З. Палякоўскі са сваім паведамленнем пра становішча ў Мсціслаўскай філіі «Маладняка» выступіў па гарачых кроках — 19 студзеня 1927 года Рашэнне аб ліквідаванні згуртавання «Агняцвет» было падмацавана двума адпаведнымі дакументамі, якія захоўваюцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь (Ф. 4п. Воп.1. Адз. зах. 2895. Арк. 41–42).

Я вырашыў прывесці толькі першы дакумент, бо ён адказвае на ўсе пытанні, а другі дае толькі падрабязную расшыфроўку першага. Агняцветаўцы прынялі рашэнне цалкам перайсці працаваць у «Маладняк», ліквідаваўшы «Агняцвет». Прыведзены ніжэй дакумент сведчыць пра тое, што сябры згуртавання «Агняцвет» зразумелі сваю «памылку» і больш не будуць працаваць на разбурэнне «Маладняка», а стануць яго сябрамі. І зноў жа паўтараю пытанне, якое так і застанецца без адказу: чаму 4 красавіка 1927 года супрацоўнікі Калінінскага акружкама КП(б)Б не ведалі пра існаванне «Агняцвета», калі даклад па гэтым пытанні быў зроблены 19 студзеня таго ж года. Дзе логіка?

Мне чамусьці здаецца, што ўсе прэтэнзіі да «Агняцвета» былі, як той казаў, высмактаныя з пальца. Усебеларускае аб'яднанне паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк» распадалася на вачах, і кампартыя шукала розныя метады для ўратавання гэтага згуртавання, але ў рэшце рэшт было прынята рашэнне аб ліквідаванні «Маладняка» і стварэнні БелАПП (Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў), а пазней і Беларускага саюза пісьменнікаў.

Заканчваю свой артыкул цытатай з пастановы Бюро ЦК КП(б)Б «О положении в «Молодняке» и некоторых задачах в отношении его в связи с общей политикой партии в вопросах художественной литературы».

Адзінаццаты пункт гэтай пастановы гучыць наступным чынам: «Бюро ЦК КП(б)Б поручает Отделу печати ускорить выполнение намеченного в плане работ создания Ассоциации рабочих и крестьянских писателей Белоруссии»[1]. На Бюро ЦК КП(б)Б Аддзелу друку быў дадзены загад падрыхтаваць да 15 кастрычніка 1928 года метадычныя рэкамендацыі наконт палітыкі партыі ў галіне мастацкай літаратуры. Пры гэтым ЦК КП(б)Б пакінула часопіс «Маладняк» органам БелАПП, і ў гэтым становішчы часопіс праіснаваў яшчэ да № 8 1932 года. З № 12 1928 па № 4 1932 — БелАПП, з № 5 па № 8 за 1932 — орган Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР. У верасні 1932 года часопіс быў ліквідаваны спецыяльнай пастановай ЦК КП(б)Б.

Адсканаваныя дакументы з артыкула можна праглядзець і прачытаць у нашай суполцы ў VK (https://vk.com/club75787481).

[1] НАРБ. — Ф. 4п. Воп.1. Адз. зах. 2895. Арк. 84.

Нацыянальная бібліятэка Беларусі